# На тым тыдні...

✓У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» **8 студзеня** адбылося адкрыццё выстаўкі **«Впечатление»** вучняў мастацкай студыі Цэнтра развіцця «Ступени». Удзельнікі прадставілі свае працы і творчыя кампазіцыі, у якіх бачныя ўнікальнасць і крэатыўнасць. Акрамя таго запланаваныя майстар-класы па «хуткай тэхніцы» мастыхінам ды інш. З 8 па 18 студзеня наведнікі маглі прагаласаваць за ўпадабаную працу.

✓**9 студзеня** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылося адкрыццё выстаўкі мастацкіх працаў навучэнцаў арт-цэнтра «Вулей» паводле творчасці Максіма Багдановіча **«Дзіцячыя краскі ў вянок паэту»**.

Пры Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна (г.п. Смілавічы) створаны Арт-цэнтр «Вулей», мэтаю якога з'яўляецца развіццё здольнасцяў дзяцей, пашырэнне іх мастацкага кругагляду, выхаванне ўмення бачыць твор, ацаніць яго, атрымліваць асалоду ад мастацтва ў самых розных яго формах. Навучэнцы па навучальнай праграме, распрацаванай Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь, наведваюць музеі. Пад час экскурсіі ў Літаратурны музей Максіма Багдановіча ўзнікла ідэя стварыць новы мастацкі праект: ілюстраваць творы беларускіх пісьменнікаў і распачаць яго менавіта з вершаў М. Багдановіча. Прадстаўленыя ілюстрацыі вучняў Арт-цэнтра «Вулей» да адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў Максіма Багдановіча «Вянок».

✓**9 студзеня** мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» і літаратурная гасцёўня газеты «Воскресение» запрасілі на ўжо традыцыйны канцэрт **«Свет Рождества»**, прымеркаваны да Хрыстовых Народзінаў. Гучалі вершы, прысвечаныя святу, у выкананні народнай артысткі Рэспублікі Беларусь Марыі Захарэвіч, заслужанай артысткі Беларусі Ірыны Нарбекавай, артысткі тэатра і кіно Алены Шабад. Дуэт Таццяны Ячнай і Алеся Чумакова выканаў традыцыйныя спевы розных народаў, прысвечаныя святу, сярод іншых цікавостак сустрэчы варта назваць выступленне маленькай «зорачкі» – спявачкі і флейтысткі Марыяны Бабіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ